# ПРАЕКТ ДЫНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ

**Патэнцыял Беларусі і Індыі дае магчымасць вывесці гандлёвае і інвестыцыйнае супрацоўніцтва краін на больш высокі ўзровень.**

Упэўненасць у гэтым выказаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, выступаючы на адкрыцці беларуска-індыйскага бізнес-форуму. Удзел у мерапрыемстве прыняў таксама Прэзідэнт Індыі Пранаб Мукерджы, які знаходзіўся ў Беларусі з афіцыйным візітам, — паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Прэзідэнт Беларусі адзначыў устойлівыя тэндэнцыі да росту таваразвароту паміж дзвюма краінамі апошнім часам. У той жа час Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што для патэнцыялу краін узровень гандлю зусім невялікі.

«Таму нам трэба, і ў ходзе гэтага форуму ў тым ліку, дамовіцца аб тым, каб гэты таваразварот на працягу ўжо наступнага года можна было падвоіць. І для гэтага ў нас ёсць усё неабходнае», — перакананы беларускі лідар.

Паводле яго слоў, у эканамічных адносінах Беларусі і Індыі намеціўся паступовы пераход ад простага гандлю да вытворчай кааперацыі, у чым зацікаўлены абодва бакі. У Індыі адкрыты прадстаўніцтвы вялікіх беларускіх прадпрыемстваў. Прапрацоўваецца магчымасць стварэння сумесных зборачных вытворчасцяў. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што разглядаюцца пытанні ўдзелу Беларусі ў мадэрнізацыі індыйскіх нафта- і вуглездабыўных магутнасцяў.

Кіраўнік беларускай дзяржавы лічыць, што Беларусь і Індыя могуць узмацніць узаемадзеянне ў прамысловасці, энергетыцы, лагістыцы, сувязі, бія- і нанатэхналогіях. Беларускі бок зацікаўлены таксама ў развіцці сумесных вытворчасцяў у галіне фармакалогіі, інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій.

«Такія прадпрыемствы мы будзем ствараць у індустрыяльным парку «Вялікі камень», — сказаў Прэзідэнт Беларусі. Ён запрасіў прадстаўнікоў індыйскіх дзелавых колаў больш дэталёва азнаёміцца як з патэнцыялам парка, так і ў цэлым краіны.

«Адкрыўшы вытворчасці ў Беларусі, вы зможаце скарыстацца беспершкодным выхадам на рынак Еўразійскага эканамічнага саюза і асвойваць рынкі Еўрапейскага саюза, — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Вы добра разумееце, што лепшай лагістыкі для работы ў гэтых двух саюзах быць не можа, таму што Беларусь геаграфічна знаходзіцца ў самым цэнтры гэтых эканамічных гігантаў».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што асаблівае значэнне Беларусь надае супрацоўніцтву на ўзроўні рэгіёнаў. На яго думку, такое ўзаемадзеянне дасць магчымасць напаўняць двухбаковыя гандлёва-эканамічныя сувязі новым зместам. Прэзідэнт дадаў, што прыкладам могуць служыць прамыя кантакты Беларусі з суб'ектамі Расійскай Федэрацыі.

Кіраўнік беларускай дзяржавы выказаў надзею, што бізнес-форум будзе карысным для ўсіх удзельнікаў, а яго вынікам стане з'яўленне новых цікавых і ўзаемавыгадных праектаў.

«У наш няпросты час вельмі многія прадпрымальнікі, бізнесмены, кіраўнікі вялікіх прадпрыемстваў гавораць аб крэдытаванні, фінансаванні больш выгадным і льготным, — адзначыў беларускі лідар. — У выніку нашых апошніх візітаў і дамоўленасцяў у Азіяцкім рэгіёне — з Кітайскай Народнай Рэспублікай, Пакістанам, Індыяй, раней В'етнамам і іншымі дзяржавамі — праблем з крэдытамі няма, і гэта вельмі выгадныя крэдыты».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў час апошняга візіту ў Беларусь старшыні КНР Сі Цзіньпіна дасягнута дамоўленасць аб выдзяленні Беларусі $7 млрд крэдытных рэсурсаў дадаткова да $15 млрд, выдадзеных раней пад невялікі працэнт. Прэзідэнт Індыі на сустрэчы з кіраўніком беларускай дзяржавы, праведзенай 3 чэрвеня, адзначыў, што ўрад Індыі падтрымлівае індыйскія і беларускія кампаніі і будзе даваць ім ільготныя крэдыты.

Кіраўнік беларускай дзяржавы падкрэсліў, што сродкі павінны накіроўвацца на эфектыўныя праекты. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ім прынята рашэнне не падзяляць у гэтым выпадку прадпрыемствы на дзяржаўныя і прыватныя. «Усе маюць права і могуць атрымаць гэтыя крэдыты пад развіццё вытворчасці», — сказаў ён.

«Таму, я сказаў бы, упершыню ў гісторыі ў Беларусі створаны такія ўнікальныя ўмовы для работы бізнесу. Галоўнае — гэта праекты. Скажу шчыра, іх проста не хапае сёння. Таму што стаў больш строгім падыход да іх: проста так, без усялякіх гарантый, вырабляць і на склад складаць прадукцыю ў наш час — справа дрэнная. Таму ёсць добры праект — будзем падтрымліваць, будзем фінансаваць», — адзначыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што візіт у Беларусь Пранаба Мукерджы сведчыць аб многім. «Прыехала вялікая група вядучых бізнесменаў Індыі, а гэта ні многа ні мала краіна, якая з'яўляецца адным з лідараў эканамічнага развіцця ў свеце, гэта гіганцкая імперыя, якая мае каласальныя магчымасці і рэсурсы. Што яшчэ трэба для беларускіх бізнесменаў, каб развіваць свой бізнес і актыўна працаваць? Калі патрэбна дадатковая падтрымка для беларускіх кампаній і індыйскіх — вы такую падтрымку заўсёды атрымаеце. І перш за ўсё ад мяне», — сказаў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы запэўніў, што Беларусь зробіць усё для таго, каб індыйскія бізнесмены, якія прыйшлі ў краіну, ніколі не сказалі пра Беларусь дрэнна або паскардзіліся на дрэнныя ўмовы. «Умовы будуць створаны ў Беларусі для вашых кампаній як для самых лепшых сяброў», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на паспяховае ўзаемадзеянне індыйскіх і беларускіх спецыялістаў па рэканструкцыі Гродзенскай ЦЭЦ-2. «Калі яны будуць так працаваць, вы можаце не клапаціцца аб праектах у Беларусі, мы заўсёды падтрымаем такія праекты. Гэта высокая якасць, гэта надзейнасць, і паказчыкі нават вышэйшыя, чым нам гарантавалі і абяцалі індыйскія калегі. Вось такія праекты мы вітаем тут у цэнтры Еўропы. Мы будзем іх заўсёды падтрымліваць», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«У той жа час нашы кампаніі, якія прыйдуць у Індыю, будуць працаваць у імя Індыі, індыйскага народа, будуць рабіць усё, каб той прадукт, які мы там будзем выпускаць разам з вамі, не меў нараканняў з боку спажыўцоў. У гэтым вы можаце быць упэўнены», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

У рамках бізнес-форуму з удзелам прэзідэнтаў Беларусі і Індыі адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця памятнага знака, прысвечанага ўзаемадзеянню індыйскіх і беларускіх спецыялістаў па рэканструкцыі Гродзенскай ЦЭЦ-2.

# БУДЗЕМ ДРУЖЫЦЬ ПАРЛАМЕНТАМІ

**Індыйскі бок чакае візіту беларускай парламенцкай дэлегацыі на чале са старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімірам Андрэйчанкам.**



Фота БЕЛТА.

**У час сустрэчы старшынь абедзвюх палат Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіла МЯСНІКОВІЧА і Уладзіміра АНДРЭЙЧАНКІ з Прэзідэнтам Індыі Пранабам МУКЕРДЖЫ.**

Аб гэтым было заяўлена на сустрэчы старшынь абедзвюх палат Нацыянальнага сходу Беларусі з Прэзідэнтам Індыі Пранабам Мукерджы, паведаміў намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Віталь Бусько.

«Прызнаны мэтазгодным абмен парламенцкімі дэлегацыямі ў найбліжэйшы час. Прэзідэнт Індыі заявіў, што яны з нецярпеннем чакаюць парламенцкую дэлегацыю на чале са спікерам, каб абмеркаваць узнятыя на сённяшняй сустрэчы пытанні з удзелам дэпутацкага корпуса», — сказаў Віталь Бусько.

Таксама дэпутат звярнуў увагу, што сустрэча прайшла ў даволі шырокім фармаце. З беларускага боку ў ёй прымалі ўдзел не толькі прадстаўнікі абедзвюх палат парламента, але таксама віцэ-спікеры і іншыя парламентарыі. Бакі канстатавалі наяўнасць добрых адносін, у тым ліку маецца на ўвазе стварэнне груп дружбы ў парламентах абедзвюх краін.

■ Тры пытанні да ўлады

# КРЭПАСЦЬ НЕ АБМІНАЕ НІВОДНАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ

**У праграме X Беларускага міжнароднага медыяфоруму «Партнёрства ў імя будучыні: спадчына Вялікай Перамогі», які распачнецца днямі ў сталіцы, значыцца наведванне яго ўдзельнікамі Брэсцкай вобласці і, вядома, Брэсцкай крэпасці. Падрыхтоўку да сустрэчы курыруе начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Брэсцкага аблвыканкама Аляксандр МУРАШКІН. Да яго — нашы пытанні.**



***— Што ўбачаць, з кім сустрэнуцца ў Брэсце супрацоўнікі друкаваных сродкаў інфармацыі і тэлеканалаў з Беларусі і замежжа?***

— Пакуль што плануецца наведванне прадстаўнікамі масмедыя нашага брэндавага прадпрыемства «Савушкаў прадукт». Яно і зразумела: многія спажыўцы за мяжой добра ведаюць малочныя прадукты брэсцкага прадпрыемства. Думаю, ім цікава будзе паглядзець на саму вытворчасць «Брэст-Літоўскай» смятаны або тварагу, сустрэцца з працаўнікамі камбіната.

Пра асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна гасцям раскажа старшыня аблвыканкама Анатоль Ліс. Губернатар пазнаёміць удзельнікаў форуму з некаторымі аспектамі супрацоўніцтва Брэстчыны з суседнімі краінамі і рэгіёнамі асобных краін. Пасля гэтага госці наведаюць мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой», ускладуць кветкі да Вечнага агню.

***— У крэпасці апошнія месяцы і дні практычна кожны дзень бываюць не толькі турысты, але і афіцыйныя дэлегацыі. Ці звязана гэта, на ваш погляд, з юбілейнай датай Перамогі, якую мы ўсе адзначаем?***

— І так, і не. Жаданне наведаць нашу галоўную славутасць, як правіла, выказваюць усе госці горада, якія прыязджаюць з дзелавымі мэтамі. У красавіку памяць абаронцаў крэпасці ўшанавалі еўрапейскія дыпламаты, грамадскія дзеячы на чале з кіраўніком прадстаўніцтва ЕС у Беларусі Майрай Морай. Літаральна некалькі дзён таму кветкі да галоўнага манумента цытадэлі ўсклаў губернатар Пскоўскай вобласці Андрэй Турчак.

А на святкаванне Дня Перамогі да нас прыязджала сапраўды шмат гасцей. Напрыклад, афіцыйныя дэлегацыі былі са Славакіі, Інгушэціі, Нідэрландаў. Варта адзначыць, што для нас не менш важныя сталі і тыя госці, якія ехалі не ў складзе дэлегацый, але праявілі ўласную ініцыятыву, не паленаваліся пераадолець многія тысячы кіламетраў і сустрэць юбілей Перамогі ў Брэсце. Я маю на ўвазе жыхароў Сібіры, Уладзівастока, краін далёкага замежжа. Народная ініцыятыва спрацоўвае не толькі ў святочныя дні, што яшчэ больш каштоўна. Нядаўна экскурсавод крэпасці расказваў, што мемарыял наведала група школьнікаў з Паволжа. Аказваецца, цэлы клас перамог у адным з праектаў, якія арганізуе іх міністэрства адукацыі. Як было абумоўлена правіламі, у пераможцаў спыталі, куды яны хочуць паехаць у якасці ўзнагароды за перамогу. Дзеці назвалі Брэсцкую крэпасць. І для іх арганізавалі паездку. Гэта надзвычай прыемна было чуць. У крэпасці сёння сапраўды ёсць што паглядзець. Акрамя ранейшых аб'ектаў, якія многім вядомыя, можна наведаць новы, ён называецца «Музей вайны — тэрыторыя міру», стала магчыма заказаць паход на Пагранічны востраў, пазнаёміцца з фартыфікацыйнай сістэмай крэпасці пазамінулага стагоддзя... Так што і ўдзельнікам міжнароднага медыяфоруму будзе што паказаць.

Увогуле ж мерапрыемствы, прысвечаныя ваенным падзеям, мужнасці і гераізму, не скончыліся. Цяпер рыхтуемся яшчэ да аднаго.

***— Маеце на ўвазе традыцыйны мітынг-рэквіем у чатыры гадзіны раніцы 22 чэрвеня?***

— Так. Дзень усенароднай памяці ахвяраў Вялікай Айчыннай вайны мы традыцыйна адзначаем тут, дзе пачалася вайна. У розныя гады мерапрыемства праходзіла па-рознаму. Аднойчы ў гэту ноч упершыню паказалі фільм «Брэсцкая крэпасць». Таксама ўпершыню тут прайшла рэканструкцыя падзей пачатку вайны, якая стала цяпер атрыбутам гэтага дня. І зноў жа па традыцыі 22 чэрвеня ў Брэст прыбывае многа гасцей. Тут мы сустракалі славутых расійскіх дзеячаў культуры, такіх як Людміла Зыкіна, Аляксандра Пахмутава, Мікалай Дабранраваў і многіх іншых. Памяць ахвяраў вайны ў ноч на 22 чэрвеня ўшаноўвалі ля сцен цытадэлі прэзідэнты і прэм'еры суседніх краін. Сёлета, як і заўсёды, ноччу прыбудуць спецыяльныя цягнікі памяці з моладдзю. Чакаем таксама Святейшага Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■

■ Ёсць жа людзі!

# «ЧУЖЫЯ ГРОШЫ ШЧАСЦЯ НЕ ПРЫНОСЯЦЬ»

## Студэнт вярнуў гаспадару згубленыя ім 1,8 тысячы долараў

**У сталіцы цягам шасці дзён шукалі гаспадара знойдзенага на вуліцы пакунку з грашыма. І ўрэшце знайшлі! Сродкі вернуты, і цяпер можна расказаць пра ўсе акалічнасці гэтага здарэння. Дагэтуль яны не выдаваліся, каб па дэталях можна было дакладна ўстанавіць іх сапраўднага ўладальніка.**

29 мая каля 19 гадзін на праспекце Незалежнасці мінчанін знайшоў у траве ля тратуара пакунак з грашыма. Знаходку мужчына адразу ж аднёс у Першамайскае РУУС. На той момант з заявай аб прапажы ў міліцыю ніхто не звяртаўся (як не звярнуўся і ў наступныя дні). Праваахоўнікі назвалі знойдзеную суму «даволі вялікай», не расшыфроўваючы — колькі. Сапраўдны гаспадар і павінен быў дзеля пацвярджэння свайго права на знаходку ўказаць дакладную суму, намінал купюр і валюту гатоўкі. Учора стала вядома, што грошы вернуты ўладальніку.

— Іх знайшоў студэнт 1993 года нараджэння. У скрутку было 1,8 тысячы долараў. Гаспадар — дзелавы чалавек, магчыма, індывідуальны прадпрымальнік. Побач з месцам згубы і месціўся яго бізнес, — распавяла «Звяздзе» прэс-афіцэр Першамайскага РУУС г. Мінска Святлана Білінская. — Паводле слоў уладальніка сродкаў, ён паклаў іх у заднюю кішэню штаноў разам з тэлефонам. Калі садзіўся ў машыну, той зазваніў. Відаць, у гэты момант, калі грамадзянін даставаў сотавы, грошы і выпалі. Дома, не знайшоўшы валюты, ён вырашыў, што яна недзе ў машыне. Абшукаў салон, пасля чаго паехаў на тое самае месца, абшукаў і там усё, распытваў людзей. Спробы аказаліся марнымі. Чалавек, мабыць, вырашыўшы, што страчанага не вярнуць, не стаў звяртацца ў міліцыю і нават з'ехаў з горада на выхадныя. Пасля вяртання яму на вочы і трапіла інфармацыя аб пошуках гаспадара знойдзенага скрутка. Грамадзянін дакладна назваў і валюту, і намінал купюр, і суму. У апорным пункце міліцыі ён парасціў нумар тэлефона маладога чалавека, які знайшоў грошы і аднёс іх у міліцыю, і падзякаваў яму. Сам малады чалавек вырашыў захаваць інкогніта, заявіўшы, што чужыя грошы шчасця не прыносяць.

Святлана Білінская зазначыла, што такія выпадкі, калі грамадзяне вяртаюць знойдзеныя чужыя грошы, здараюцца рэдка. «Губляюць часта, вяртаюць — не вельмі». А людзей, якія заяўлялі, што гэта яны страцілі грошы, тэлефанавала шмат: толькі за першую гадзіну пасля размяшчэння адпаведнай інфармацыі ў міліцыю звярнуліся тры чалавекі...

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■